**Спадчына.** Нацыянальная бібліятэка Беларусі атрымала невядомыя фатаграфіі сям'і Змітрака Бядулі. Святкаванне 135-годдзя з дня нараджэння класіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбываецца на працягу ўсяго года і ўключае шэраг важных і яркіх падзей, адзначылі ў НББ. Адным з асабліва каштоўных вынікаў гэтай працы стала блізкае знаёмства з сынам Змітрака Бядулі — Яфімам Плаўнікам. Апошнім і самым нечаканым падарункам стала перадача Яфімам Самуілавічам у фонды кніжніцы раней невядомых фатаграфій малодшых братоў пісьменніка — Мацвея і Ізраіля Плаўнікаў. Гэтыя здымкі могуць распавесці шмат новага і цікавага аб сям'і класіка, яго асяроддзі, выхаванні, дазволяць зразумець, на якіх каштоўнасцях выхоўваўся сам Змітрок Бядуля. Дакументы папоўняць архіўныя зборы Нацыянальнай бібліятэкі і неўзабаве стануць даступныя чытачам і наведвальнікам, распавялі ў НББ.